# Юрый Бондар: «Мы не маем права працаваць горш»

Такое супадзенне сустракаецца нячаста – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў і яго рэктар Юрый БОНДАР амаль аднагодкі. Наколькі гэты тандэм спрыяе выкананню задач, што стаяць перад адной з вядучых культуралагічных ВНУ нашай краіны, карэспандэнт «Беларускай думкі» і паспрабаваў высветліць у маладога кіраўніка гэтай адукацыйнай установы.



Юрый БОНДАР

**– Юрый Паўлавіч, наколькі складана ці, наадварот, лёгка працаваць кіраўніком вышэйшай навучальнай установы ў той час, калі твой папярэднік узначальвае профільнае міністэрства?**

– Як бы нечакана гэта ні гучала, але – складана. Прэзідэнт краіны, прызначаючы Барыса Уладзіміравіча Святлова міністрам культуры, адзначыў, што на пасадзе рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў ён праявіў сябе як надзвычай дасведчаны адміністратар, здолеў на якасна новым узроўні выбудаваць работу ўніверсітэта. Мая ж задача – не толькі не апусціць гэтую высокую планку, але і даць новы імпульс развіццю ўніверсітэта.

Мы проста не маем права памыляцца і працаваць горш. Мы, я маю на ўвазе ўвесь прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта і яго адміністрацыйны апарат, абавязаны працаваць лепш. Таму пастаянна даводзіцца быць у творчым пошуку, эксперыментаваць і, натуральна, набіваць гузы. Аднак без гэтага нельга. Не мной жа прыдумана: хто шукае, той абавязкова знаходзіць.

Вядома, у вырашэнні найбольш складаных праблем падначаленай мне ВНУ можна было б іншым разам задзейнічаць і адміністрацыйны рэсурс, пратэкцыю. Але мой жыццёвы прынцып іншы – свае праблемы кожны павінен вырашаць сам, і яго цвёрда прытрымліваюся. Дарэчы, як і яшчэ аднаго правіла: кіраўнік павінен клапаціцца пра свой дзелавы імідж і падмацоўваць яго канкрэтнымі практычнымі справамі.

**– А наколькі клопатная ў Вас «гаспадарка»?**

– Наш універсітэт – адна з самых маладых дзяржаўных ВНУ краіны. Ён з'яўляецца пераемнікам створанага ў 1975 годзе Мінскага інстытута культуры. У структуру ўніверсітэта ўваходзяць шэсць факультэтаў – культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, музычнага мастацтва, інфармацыйна-дакументных камунікацый, завочнага навучання і факультэт дадатковай адукацыі, 29 спецыяльных і агульнаўніверсітэцкіх кафедраў і яшчэ з дзясятак падраздзяленняў, якім даручана падтрымліваць вучэбна-метадычную, выхаваўчую, навуковую, творчую, фінансавава-гаспадарчую дзейнасць нашай установы, забяспечваць быт студэнтаў і г.д. Акрамя таго, універсітэт мае філіял факультэта завочнага навучання ў Мазыры,

**НАША ДАСЬЕ**

БОНДАР Юрый Паўлавіч.

Нарадзіўся ў 1973 годзе ў г. Мінску. У 1997 годзе скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2007 годзе – Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў працуе з 2001 года: выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт кафедры культуралогіі, першы прарэктар. 3 лютага 2013 года – рэктар БДУКіМ.

Кандыдат палітычных навук (2006), дацэнт (2009).

Аўтар цыкла артыкулаў і дакладаў, манаграфіі пра станаўленне палітычнай навукі ў пераходных грамадствах, суаўтар дзвюх версій вучэбна-метадычнага комплексу па паліталогіі.

Сфера навуковых інтарэсаў: метадалогія, гісторыя палітычнай навукі, тэндэнцыі яе эвалюцыі на постсавецкай прасторы, дзяржаўная культурная палітыка, метадалагічныя і прыкладныя аспекты палітычнай сацыялізацыі асобы спецыяліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкую галерэю ў Палацы Рэспублікі, уласны прадзюсарскі цэнтр.

Мы праводзім падрыхтоўку спецыялістаў па 14 асноўных спецыяльнасцях – «Культуралогія», «Літаратурная работа», «Рэжысура свят», «Сацыяльна-культурная дзейнасць», «Народная творчасць», «Дырыжыраванне», «Харэаграфічнае мастацтва», «Мастацтва эстрады», «Спевы», «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», «Мастацтвазнаўства», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Духавыя інструменты». Усяго ж ва ўніверсітэце навучаецца больш за 5 тыс. студэнтаў на дзённай і завочнай формах навучання. Прафесарска-выкладчыцкі склад – больш за 300 чалавек, з іх 27 маюць вучоную ступень доктара навук і вучонае званне прафесара, 164 – кандыдата навук і дацэнта.

Ва ўніверсітэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва са скарочаным тэрмінам навучання з ліку выпускнікоў Магілёўскага дзяржаўнага бібліятэчнага каледжа імя А.С. Пушкіна, Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў і Дзяржаўнай сярэдняй школы-каледжа мастацтваў (г. Бабруйск) і іншых устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**– А як суадносіцца з БДУКіМ Інстытут культуры Беларусі?**

– Юрыдычна ніяк. Гэта – самастойная адукацыйная ўстанова, створаная Міністэрствам культуры для павышэння кваліфікацыі кадраў галіны.

Калі Вы ўжо закранулі гэтую тэму, то зазначу: асабіста я даволі скептычна стаўлюся да самой ідэі «аўтаномнага існавання» падобных адукацыйных структур. Работа любой навучальнай установы грунтуецца на трох кітах – кваліфікаваным прафесарска-выкладчыцкім складзе, навукова-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу, сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базе. Лічу, што якаснае і эфектыўнае стварэнне азначаных умоў сёння пад сілу толькі буйным адукацыйным цэнтрам – вядучым вышэйшым навучальным установам краіны.

Гавару так адкрыта пра гэта не таму, што адстойваю інтарэсы сваёй установы, як камусьці можа падацца, а дзеля агульнай, дзяржаўнай карысці. Так, у нас ёсць факультэт дадатковай адукацыі. Па колькасці студэнтаў ён мае права называцца інстытутам: там амаль 270 чалавек навучаецца ў год па 11 спецыяльнасцях. Атрымліваецца, што ён і згаданая вышэй установа існуюць паралельна і практычна займаюцца адным і тым жа. Толькі адна з іх ажыццяўляе дзейнасць на платнай аснове, а другая «ляжыць на бюджэце».

Падаецца лагічным, што наш факультэт мог бы праводзіць і павышэнне кваліфікацыі кадраў, але мы, каб не ствараць канкурэнцыю Інстытуту культуры Беларусі, адышлі ўбок, займаемся ў асноўным перападрыхтоўкай і іншымі відамі дадатковай адукацыі. Хоць у нас ёсць і высокакваліфікаваныя кадры, і неабходныя ўмовы, і свая адметная методыка…

Дарэчы, адзначу, што ў нас сумесна з Міністэрствам культуры Азербайджана ажыццяўляецца вельмі цікавы, паспяховы і запатрабаваны адукацыйны праект, накіраваны якраз на павышэнне кваліфікацыі работнікаў устаноў культуры, нашых азербайджанскіх калег. За апошнія чатыры гады – гэта час, на працягу якога ідзе рэалізацыя – у нас прайшлі перападрыхтоўку на платнай аснове 50 чалавек.

**– Падчас назначэння Вас на рэктарскую пасаду кіраўнік дзяржавы паставіў перад Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў першарадныя задачы: аптымізацыя тэрмінаў навучання, арыентацыя на практычную падрыхтоўку маладых спецыялістаў і іх рацыянальнае размеркаванне ў рэгіёны Беларусі. Як выконваецца гэта даручэнне?**

– Гэтыя задачы для мяне, як рэктара, прыярытэтныя. З мэтай аптымізацыі тэрмінаў навучання намі перапрацаваны адукацыйныя стандарты і тыпавыя вучэбныя планы па ўсіх спецыяльнасцях універсітэта, што дало магчымасць ужо ў бягучым 2013/2014 навучальным годзе скараціць тэрмін падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй да 4 гадоў. Скарачэнне стала магчымым за кошт аптымізацыі цыкла сацыяльна-гуманітарных, прыродазнаўчых дысцыплін, змяншэння колькасці гадзін па няпрофільных дысцыплінах.

У працэсе распрацоўкі новых адукацыйных стандартаў мы надалі асаблівую ўвагу выкананню адной з прыярытэтных задач развіцця вышэйшай адукацыі – узмацненню практыка-арыентаванай падрыхтоўкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтаў. У адпаведнасці з вучэбнымі планамі трэцяга пакалення па творчых спецыяльнасцях больш за 60 % аўдыторных заняткаў складаюць практычныя, лабараторныя і індывідуальныя, былі перагледжаны і патрабаванні да арганізацыі практыкі.

Мы правялі вялікую работу па ўдасканаленні сувязей універсітэта з заказчыкамі кадраў: заключылі 58 дагавораў з базавымі арганізацыямі і атрымалі больш за 120 доўгатэрміновых заявак ад упраўленняў ідэалогіі, культуры і маладзёжнай палітыкі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Як вынік, забяспечылі гарантаваны «партфель заказаў» на падрыхтоўку спецыялістаў і далейшае іх працаўладкаванне.

Што ж тычыцца размеркавання па выніках 2012/2013 навучальнага года, то дазволю сабе прывесці некалькі лічбаў для нагляднасці: 100 % нашых выпускнікоў размеркаваны і накіраваны на працу па спецыяльнасці, з іх 64,5 % (204 маладыя спецыялісты) у рэгіёны, а 35,5 % атрымалі першае працоўнае месца ў Мінску.

**– Актуальная педагагічная праблема – якасць падрыхтоўкі кадраў для сферы культуры. Якія інавацыйныя тэхналагічныя інструменты вырашэння гэтай праблемы мае ўніверсітэт і як яны выкарыстоўваюцца?**

– Гэта пытанне шматграннае. Пазначу толькі асноўныя вектары дзейнасці калектыву ўніверсітэта ў дадзеным кірунку. Зыходным жа пунктам нашых дзеянняў стала пераасэнсаванне кампетэнцый спецыяліста сферы культуры ў кантэксце мадэрнізацыі грамадства, ідэалогіі і палітыкі дзяржавы, нацыянальных інтарэсаў. З гэтай мэтай мы правялі абнаўленне зместу вучэбна-выхаваўчага працэсу і яго навукова-метадычнае забеспячэнне. Быў скарэкціраваны алгарытм выкладання дысцыплін. Паступова асвойваем рэйтынгавую сістэму ацэнкі ведаў, навыкаў, умення студэнтаў, укараняем тэхналогіі менеджменту якасці адукацыі.

Стратэгічная мэта і надзённая задача калектыву ўніверсітэта – фарміраванне фундаментальных кампетэнцый спецыяліста: навуковы светапогляд; гуманістычнае духоўна-маральнае развіццё; стымуляванне творчага, інавацыйнага мыслення; кампетэнтнасць у палітыцы і ідэалогіі дзяржавы; устойлівыя навыкі арганізатара ідэйна-




▲ Галоўны корпус БДУКіМ

выхаваўчай работы; дэмакратычная культура камунікацыі.

У фокусе ўвагі нашых выкладчыкаў – адукацыйныя праграмы: тэарэтыка-метадалагічны ўзровень, светапоглядны патэнцыял, практыка-прафесійная накіраванасць, адпаведнасць нацыянальным інтарэсам і каштоўнасцям.

Наш канцэптуальна-тэхналагічны прыярытэт – комплекснае выкарыстанне навукова-метадычнага, інфармацыйна-аналітычнага і кантрольна-дыягнастычнага рэсурсу. Займаемся і падрыхтоўкай электронных вучэбна-метадычных комплексаў.

**– Сённяшняя рэальнасць дыктуе новыя патрабаванні да работніка культуры. Якую ролю, на Ваш погляд, павінен выконваць у сучасным грамадстве выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў?**

– Уся адукацыйная дзейнасць ва ўніверсітэце накіравана на падрыхтоўку спецыялістаў, здольных кваліфікавана і эфектыўна прапагандаваць дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, далучаць людзей да розных формаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Нашым выпускнікам трэба будзе на практыцы канструяваць выхаваўчыя і педагагічныя праграмы, праектаваць культурна-забаўляльныя паслугі, напаўняць новым зместам дзейнасць сацыяльна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




▲▶Студэнты БДУКіМ адзначаюць Дзень роднай мовы. 2012 год

культурных устаноў, распрацоўваць новыя арганізацыйна-кіраўнічыя структуры ў адпаведнасці з патрабаваннем часу і рэальнымі запытамі насельніцтва рэгіёнаў Беларусі.

Адметнай асаблівасцю сённяшняга дня стала камерцыялізацыя устаноў культуры. Большасць з іх актыўна шукаюць дадатковыя крыніцы фінансавання, перш за ўсё за кошт развіцця платных паслуг, укаранення механізмаў узаемадзеяння камерцыйных і некамерцыйных складнікаў сферы культуры. Таму кожны выпускнік павінен валодаць навыкамі менеджменту як сістэмы кіраўніцкай дзейнасці, якая забяспечвае паспяховае функцыянаванне сацыяльна-культурных інстытутаў, а таксама веданнем рэкламных тэхналогій і сацыяльна-культурнага праектавання, уключаючы арт-менеджмент і тэхналогіі прадзюсарскай дзейнасці.

Усім гэтым у поўнай меры і валодае практычна кожны наш выпускнік.

**– А між тым адна з асноўных задач універсітэта – падрыхтоўка кадраў для вёскі. Але іх не хапае. Што трэба зрабіць, каб выпускнікі БДУКіМ заставаліся працаваць у вёсцы?**

– Так склалася, што на працягу апошніх пяці гадоў я ўзначальваю камісію па размеркаванні выпускнікоў. На пасяджэнні запрашаем прадстаўнікоў рэгіянальных упраўленняў культуры, кіраўнікоў устаноў культуры – заказчыкаў кадраў. У час зацікаўленых гутарак адбываецца абмен думкамі, госці дзеляцца вопытам па замацаванні маладых спецыялістаў, непасрэдна маюць зносіны з выпускнікамі, прапануюць ім умовы будучай працы. Такім чынам, мы практычна перадаём наваспечаных работнікаў культуры з рук у рукі пад асабістую адказнасць будучага працадаўцы.

Аднак практыка паказвае, што маладыя спецыялісты застаюцца там, дзе наймальнік неабыякава ставіцца да іх праблем – сочыць за ўмовамі працы, выдзяляе месца ў інтэрнаце, устанаўлівае персанальную надбаўку да зарплаты, уключае ў склад жыллёвых кааператываў. Лічу, што станоўчы вопыт работы асобных райвыканкамаў па замацаванні маладых спецыялістаў на іх першым працоўным месцы мог бы быць абагульнены і распаўсюджаны на рэспубліканскім семінары.

Эфектыўным сродкам вырашэння кадравых праблем сельскіх устаноў культуры з'яўляецца і мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў. Толькі за два апошнія навучальныя гады ўніверсітэт культуры і мастацтваў скончылі 89 гэтак званых «мэтавікоў». Найбольшая колькасць з іх – па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» – 51 выпускнік. Усе яны былі накі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раваны на працу ў падраздзяленні культуры райвыканкамаў, з якімі былі заключаны дагаворы на мэтавую падрыхтоўку, і працягваюць там працаваць.

**– Дарэчы, а якія вынікі апошняй уступнай кампаніі ва ўніверсітэт?**

– Сёлета мы, на жаль, не трапілі ў лік тых сямі беларускіх ВНУ, якія выканалі кантрольныя лічбы прыёму. Але не дабралі мы студэнтаў толькі на бібліятэчнай спецыялізацыі з-за падзення прэстыжнасці прафесіі бібліятэкара. Моладзь у пераважнай сваёй масе лічыць яе малаперспектыўнай. А між тым бібліятэкар займаецца не толькі выдачай і прыёмкай кніг. Гэта – высокаадукаваны спецыяліст, які разбіраецца ў мастацтве, літаратуры, архітэктуры, мае глыбокія гістарычныя веды і наогул надзвычай шырокага кругагляду чалавек, стасункі з якім, як, зрэшты, і з кнігай увогуле, не заменіць ніводзін камп'ютар.

Відавочна, што ў папулярызацыі бібліятэчнай справы ўніверсітэт культуры і мастацтваў пакуль не дапрацоўвае. Аднак, прааналізаваўшы вынікі сёлетняй уступнай кампаніі, па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» мы распрацавалі своеасаблівы антыкрызісны план, які прадугледжвае канкрэтныя захады па шырокім распаўсюджванні ў маладзёжным асяродку ведаў пра згаданую прафесію: наладжваюцца сустрэчы нашых выкладчыкаў з выпускнікамі школ, арганізуюцца экскурсіі для вучняў старшых класаў у вядучыя бібліятэкі краіны, у наш універсітэцкі музей. Дарэчы, сістэмна мы займаемся прафарыентацыяй і па іншых спецыяльнасцях.

Канкрэтныя вынікі сёлетняй уступнай кампаніі сведчаць, што абітурыенцкая цікавасць да нашага ўніверсітэта расце: калі летась агульны конкурс пры паступленні складаў 1,9 чалавека на месца, то сёлета нават з улікам недабору па бібліятэчнай спецыялізацыі – 2,2.

**– У дзейнасці многіх беларускіх ВНУ існуе такое паняцце, як экспарт адукацыйных паслуг. Наколькі ён пашыраны ва ўніверсітэце?**

– Гэтак званы экспарт адукацыйных паслуг забяспечваецца за кошт навучання замежных грамадзян. У БДУКіМ навучаюцца 280 замежнікаў з 17 краін. Стратэгічны ж наш партнёр – Кітай. Студэнты з Паднябеснай вывучаюць у нас рускую мову як замежную, праходзяць падрыхтоўку для паступлення ў беларускія ВНУ, а таксама атрымліваюць вышэйшую адукацыю, займаюцца ў магістратуры і нават аспірантуры. У асноўным свае навуковыя пошукі яны праводзяць у культуралагічнай і мастацтвазнаўчай сферах. І хоць іх даследаванні тычацца асаблівасцей кітайскай культуры, гэта ім не перашкаджае паспяхова абараняць дысертацыі на кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры, якой загадвае доктар мастацтвазнаўства, прафесар Вера Паўлаўна Пракапцова.

Акрамя студэнтаў з Кітая, у нас навучаюцца грамадзяне Нігерыі, Камеруна, Турцыі, Туркменістана, Літвы, Латвіі, Расіі, Азербайджана і некаторых іншых краін.

**– Чаго, на Вашу думку, не хапае БДУКіМ у вучэбным працэсе? Магчыма, у перспектыве з'явяцца нейкія новыя спецыялізацыі?**

– Універсітэт абавязаны аператыўна рэагаваць на кадравыя запатрабаванні галіны. У бягучым навучальным годзе мы адкрылі набор на такія новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, як «Арт-менеджмент», «Культурная спадчына і турызм», «Менеджмент рэкламы і сувязяў з грамадскасцю», і ўжо «на старце» яны заваявалі папулярнасць – конкурс склаў ад 2,5 да 4 чалавек на месца.

У 2013/2014 навучальным годзе з'явіліся новы напрамак спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)» і новая спецыяльнасць магістратуры з паглыбленай падрыхтоўкай спецыялістаў «Фальклор». Рыхтуемся да адкрыцця курса навучання на англійскай мове па прывабнай для замежных студэнтаў спецыяльнасці «Культуралогія».

У гэтым навучальным годзе накіроўваем 11 нашых выкладчыкаў для стажыроўкі ў такія аўтарытэтныя адукацыйныя цэнтры, як Расійскі ўніверсітэт тэатральнага мастацтва, Расійская акадэмія музыкі імя Гнесіных, Санкт-Пецярбургская дзяржаўная акадэмія тэатральнага мастацтва, Літоўскі цэнтр танца, Бібліятэка Расійскай акадэміі навук.

Спрабуем укараняць новыя падыходы ў арганізацыі адукацыйнага працэсу. Вядзём сістэмную работу па запрашэнні выкладчыкаў, вядомых дзеячаў культуры і мастацтва з Расіі, Латвіі, Швецыі, Украіны,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Польшчы для правядзення лекцый, практычных, семінарскіх заняткаў, круглых сталоў, майстар-класаў.

Прынамсі, у розны час нашы студэнты з задавальненнем наведвалі лекцыі знакамітага польскага кінарэжысёра Кшыштафа Занусі, народнага мастака СССР Аляксандра Шылава, заслужанага артыста Украіны Вадзіма Мулермана, вядомага расійскага акцёра тэатра і кіно прадзюсара Леаніда Ярмольніка… Кожны з іх – унікальная асоба. І, акрамя атрымання прафесійных навыкаў, такія сустрэчы маюць каласальны выхаваўчы патэнцыял.

**– А ці частыя госці ў вашых студэнтаў мэтры беларускага мастацтва?**

– Многія з іх працуюць ва ўніверсітэце. Скажам, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча Міхаіл Паўлавіч Дрынеўскі – старшыня дзяржкамісіі па выніковай атэстацыі выпускнікоў, а народны артыст Беларусі Аляксандр Ціхановіч – член прадметных камісій па прыёму ўступных іспытаў па класе вакалу. Заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева загадвае ў нас кафедрай мастацтва эстрады.

Народны артыст Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Саюзнай дзяржавы мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі» прафесар Міхаіл Якаўлевіч Фінберг, нягледзячы на тое, што з'яўляецца прафесарам іншай творчай ВНУ – Беларускай акадэміі музыкі, рэгулярна праводзіць майстар-класы для нашых студэнтаў, запрашае іх на канцэрты свайго аркестра.

І такіх прыкладаў паспяховага супрацоўніцтва з вядомымі творчымі асобамі Беларусі можна назваць з добры дзясятак, за што мы шчыра ўдзячныя нашым мэтрам!

**– Раскажыце пра найбольш значныя культуралагічныя праекты БДУКіМ.**

– Кожны наш праект варты асобнай гутаркі, паколькі мае сваю гісторыю і ўнікальны па сваім змесце. У ліку найбольш значных хацелася б назваць Кірыла-Мяфодзьеўскія чытанні, якія праводзяцца сумесна з Экзархатам Беларускай праваслаўнай царквы і Інстытутам тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 2014 год будзе для гэтага праекта юбілейным, дваццатым.

22 гады існуе ў нашым універсітэце і фестываль мастацтваў «Арт-мажор» – штогадовы публічны экзамен для студэнтаў творчых спецыяльнасцей і мастацкіх калектываў, які праводзіцца на лепшых канцэртных пляцоўках Мінска.

Нельга абысці ўвагай і студэнцкі конкурс «Праяўленне» – своеасаблівае спаборніцтва каманд універсітэта, што прадстаўляюць на суд журы комплексна падрыхтаваныя праграмы, у працэсе пастаноўкі якіх задзейнічаны і рэжысёры, і выканаўцы, і менеджары па «раскрутцы» творчай прадукцыі. А таксама – сацыяльны праект «Белы фестываль», які праводзіцца нашымі студэнтамі для дзяцей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Ідэя яго нарадзілася пасля прэзентацыі ва ўніверсітэце «Школы дабрыні» народнага артыста Расіі Юрыя Куклачова.

Зараз вядзецца работа па падрыхтоўцы яшчэ аднаго маштабнага праекта – пастаноўкі мюзікла «Дуброўскі» кампазітара Кіма Брэйтбурга. Прэм'ера запланавана на канец мая 2014 года на сцэне Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра.

**– А яшчэ, наколькі я ведаю, пры БДУКіМ існуе і «Нясвіжская акадэмія».**

– Міжнародная летняя школа паслядыпломнай адукацыі «Нясвіжская акадэмія» – гэта культурна-адукацыйны праект, які рэалізуецца пры падтрымцы

▼ Майстар-клас для студэнтаў БДУКіМ праводзіць народны артыст Расіі Юрый Куклачоў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь нашым універсітэтам сумесна з Інстытутам спадчыны Польшчы. Важным аспектам дзейнасці акадэміі з'яўляецца тое, што тут рыхтуюцца не вузкія спецыялісты, кампетэнтныя толькі ў справе аховы нацыянальнай культуры, але прафесіяналы, здольныя стварыць гнуткую стратэгію адаптацыі культурнай спадчыны ў сучасным сацыякультурным асяроддзі. Набор слухачоў у «Нясвіжскую акадэмію» праводзіцца на конкурснай аснове з ліку спецыялістаў у галіне захавання аб'ектаў матэрыяльнакультурнай спадчыны з Беларусі, Украіны, Літвы. А тэарэтычныя і практычныя заняткі з імі ідуць непасрэдна на гісторыкакультурных аб'ектах нашай краіны і Польшчы. Ад 1995 года, калі адбыўся першы выпуск «Нясвіжскай акадэміі», навучанне ў ёй прайшлі больш за 200 слухачоў.

**– Беларускі ўніверсітэт культуры і мастацтваў заўсёды быў у авангардзе даследавання вуснай народнай творчасці. Якія напрацоўкі існуюць у справе захавання беларускіх нацыянальных традыцый і фальклору?**

– Максім Багдановіч калісьці зазначыў: «Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы». Скажу вам, што на працягу ўсіх 38 гадоў існавання ўніверсітэта нашы студэнты і выкладчыкі сваімі справамі даказваюць праўдзівасць гэтых мудрых слоў класіка.

Ва ўніверсітэце існуе факультэт традыцыйнай беларускай культуры, дзе рыхтуюць спецыялістаў па этналогіі і фальклору, беларускаму танцу, рэжысуры народных абрадаў і святаў, традыцыйных рамёствах. Песенны фальклор складае аснову рэпертуару студэнцкіх мастацкіх калектываў «Валачобнікі», «Грамніцы», «Беларуская песня», «Талака».

Элементы традыцыйнай культуры арганічна ўключаны ў змест лекцыйных і практычных курсаў, праводзіцца інтэнсіўная экспедыцыйная дзейнасць, якая інтэгравана ў адукацыйны працэс: студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў вывучаюць на месцах традыцыйныя беларускія абрады – абрад «Страла» ў Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці, абрады «Жаніцьба Цярэшкі» ў Лепельскім і «Купалле» ў Полацкім раёнах Віцебскай вобласці.





▲ Слухачы «Нясвіжскай акадэміі»

Асноўныя інавацыйныя дасягненні выкладчыкаў кафедры этналогіі і фальклору – распрацоўка і паспяховае ўкараненне мадэлі падрыхтоўкі спецыяліста-практыка па захаванні фальклору, што абумоўлівае атрыманне не толькі шырокай прафесійнай адукацыі, але і глыбокіх практычных навыкаў.

Адукацыйны працэс цесна звязаны з навукова-метадычнай работай выкладчыкаў, з правядзеннем штогадовай Міжнароднай канферэнцыі «Аўтэнтычны фальклор», з абавязковай падрыхтоўкай двух канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі» і своеасаблівых майстар-класаў – дзвюх рэспубліканскіх сезонных фальклорных школ для дзяцей і Тыдня фальклорнаэтнаграфічных фільмаў для моладзі. Дыпломнікі займаюцца рэвіталізацыяй традыцыйных нацыянальных абрадаў паводле матэрыялаў, падрыхтаваных культурнаантрапалагічнай экспедыцыяй.

Дарэчы, намаганні нашага калектыву па ахове этнічнай культуры беларусаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атрымалі высокую ацэнку. У 2008 годзе спецыялізацыя «Этнафоназнаўства» адзначана дыпломам ЮНЕСКА за захаванне фальклору – як прызнанне паспяховай канцэптуальнай падрыхтоўкі спецыялістаў па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

**– У час адной з першых сустрэч з калектывам і студэнтамі ўжо як рэктар Вы выказаліся за актыўнае развіццё спорту ва ўніверсітэце...**

– Чаму Вас гэта здзіўляе? Будучы работнік культуры павінен быць здаровым. А рэктар абавязаны праяўляць клопат пра здароўе сваіх студэнтаў. Памятаеце знакамітую фразу Джона Кенэдзі: «У дваццатым стагоддзі прэстыж нацыі вызначаюць два фактары – поспехі ў космасе і колькасць заваяваных залатых алімпійскіх узнагарод». Мы жывём ужо ў стагоддзі дваццаць першым, але развіццё спорту і фізічнай культуры не перастае быць прыярытэтам, асабліва калі гаворыцца пра новае пакаленне. Хоць спорт і не з'яўляецца профілем нашай ВНУ, мы шчыра радуемся добрым спартыўным вынікам, якія паказваюць нашы студэнты на розных, няхай і аматарскіх, спаборніцтвах.

**– Аднак універсітэт мае пэўныя праблемы са спартыўнай базай?**

– На жаль, гэта так. Шэсць гадоў таму пачалося ўзвядзенне ўніверсітэцкага спартыўнага комплексу. Але па сённяшні дзень будаўнікі не могуць давесці распачатае да лагічнага завяршэння. Гэты факт удвая нас засмучае, бо спартыўны комплекс задумваўся як шматфункцыянальны цэнтр, у якім прадугледжвалася трансфармацыя спартыўных пляцовак у канцэртную залу на 1200 месцаў. Як вядома, мастацкія калектывы ўніверсітэта вядуць вялікую канцэртную дзейнасць, але ўласнай сцэнічнай пляцоўкі не маюць. Адзіная наша канцэртная зала на 115 месцаў – гэта перароблeная аўдыторыя.

**– Юрый Паўлавіч, Вы маеце навуковую ступень па спецыяльнасці «Паліталогія», з'яўляецеся аўтарам прац па палітычнай праблематыцы, у Вас – базавая юрыдычная адукацыя. Наколькі гэта дапамагае прафесіянальна выконваць ускладзеныя на рэктара культуралагічнай ВНУ абавязкі?**

– Так, вядома дапамагае. Я перакананы, што палітычная адукаванасць і прававая кампетэнтнасць сучаснага спецыяліста, незалежна ад яго службовага статусу, – абавязковая ўмова паспяховай прафесіянальнай дзейнасці.

Наш выбар – дэмакратычная, прававая сацыяльная дзяржава. Гэты выбар складае ядро стратэгіі развіцця Беларусі ў XXI стагоддзі. Адсюль вынікае галоўная задача ВНУ сферы культуры – фарміраванне асобасна-прафесійных кампетэнцый спецыяліста, здольнага абараняць і творча ажыццяўляць палітыку і ідэалогію дзяржавы.

Як я разумею, ключавая задача кіраўнікоў, прафесараў і выкладчыкаў універсітэта – паслядоўная і якасная рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, навукі і адукацыі. Мая паліталагічная і юрыдычная спецыялізацыя не замінае, а наадварот, спрыяе дасягненню мэт, карысных нашаму грамадству і дзяржаве.

**– З Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў звязана ўся Ваша працоўная біяграфія – Вы прайшлі шлях ад звычайнага выкладчыка да рэктара. І гэта акалічнасць гаворыць сама за сябе. І ўсё ж, што для Вас значыць БДУКіМ?**

– Працоўная біяграфія амаль усіх нашых супрацоўнікаў непарыўна знітавана з універсітэтам. І мой прыклад тут хутчэй не выключэнне, а правіла. Быць студэнтам, аспірантам, выкладчыкам, кіраўніком ва ўніверсітэце культуры – гэта асаблівы стыль жыцця, асаблівы светапогляд, абсалютна непаўторны стан душы. Таму БДУКіМ – вельмі шматгранны феномен, які ўплывае на ўсе аспекты майго жыцця, фактычна фарміруе яго. Але самае галоўнае – гэта магчымасць працаваць і аддаваць усе свае сілы на карысць Радзімы, на развіццё і ўзбагачэнне нацыянальнай культуры, на падрыхтоўку і выхаванне культурнай эліты нацыі, якая ў вялікай ступені будзе вызначаць ідэнтычнасць і адметнасць беларусаў і нашай краіны ў цэлым у бліжэйшыя дзесяцігоддзі. Гэта – найвялікшая адказнасць і адначасова вялікі гонар, а таксама – разуменне сваёй ролі ў развіцці сучаснай беларускай дзяржавы. Менавіта яны фарміруюць тое адметнае і непараўнальнае значэнне, якое мае ўніверсітэт для мяне як для яго рэктара, як для чалавека, які праз служэнне ўніверсітэту служыць беларускай культуры.

**Гутарыў Сяргей ГАЛОЎКА**



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ